УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
13 снежня 2004 г. № 601

# Аб некаторых пытаннях дзейнасці фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

Изменения и дополнения:

Указ Президента Республики Беларусь от 22 февраля 2007 г. № 103 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2007 г., № 53, 1/8385) <P30700103>;

Указ Президента Республики Беларусь от 18 октября 2007 г. № 527 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2007 г., № 252, 1/9038) <P30700527>;

Указ Президента Республики Беларусь от 16 июля 2009 г. № 383 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2009 г., № 172, 1/10867) <P30900383>;

Указ Президента Республики Беларусь от 9 июля 2010 г. № 360 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2010 г., № 170, 1/11779) <P31000360>;

Указ Президента Республики Беларусь от 26 мая 2011 г. № 218 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., № 61, 1/12565) <P31100218>;

Указ Президента Республики Беларусь от 11 января 2014 г. № 17 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 21.01.2014, 1/14748) <P31400017>;

Указ Президента Республики Беларусь от 25 мая 2015 г. № 214 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 27.05.2015, 1/15818) <P31500214>;

Указ Президента Республики Беларусь от 24 января 2017 г. № 23 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 27.01.2017, 1/16876) <P31700023>;

Указ Президента Республики Беларусь от 10 января 2018 г. № 11 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 13.01.2018, 1/17461) <P31800011>;

Указ Президента Республики Беларусь от 16 августа 2019 г. № 309 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 22.08.2019, 1/18524) <P31900309>;

Указ Президента Республики Беларусь от 12 мая 2020 г. № 161 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 14.05.2020, 1/18991) <P32000161>;

Указ Президента Республики Беларусь от 4 июня 2021 г. № 202 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 05.06.2021, 1/19707) <P32100202>;

Указ Президента Республики Беларусь от 22 мая 2023 г. № 148 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 24.05.2023, 1/20862) <P32300148>

1. Зацвердзіць прыкладзеныя:

ЭТАЛОН
*Официальная правовая информация*
*Информационно-поисковая система "ЭТАЛОН", 17.11.2023*
*Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*

Палажэнне аб фондзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва;

склад савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

2. Прызнаць страціўшымі сілу:

частку другую пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 красавіка 1998 г. № 211 «Аб фондзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва» (Збор дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 11, арт. 292; Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2001 г., № 23, 1/2435; 2002 г., № 64, 1/3728);

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 мая 2002 г. № 279 «Аб зацвярджэнні складу савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., № 64, 1/3728).

3. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
13.12.2004 № 601
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
24.01.2017 № 23)

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб фондзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

1. Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (далей – фонд) створаны ў мэтах падтрымкі аховы гісторыка-культурнай спадчыны, захавання і развіцця нацыянальных культурных традыцый, ажыццяўлення культурных праектаў, падтрымкі музейнай і бібліятэчнай справы, забеспячэння навучання і прафесійнага росту работнікаў культуры, творчых работнікаў, а таксама навучэнцаў, аспірантаў, дактарантаў ва ўзросце звыш 31 года і педагагічных работнікаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях, звязаных з практычнай, творчай і навуковай дзейнасцю ў сферы культуры, пашырэння міжнародных культурных сувязей, папулярызацыі і распаўсюджвання беларускай нацыянальнай культуры за мяжой.

2. Крыніцы фарміравання фонду:

сродкі рэспубліканскага бюджэту, якія прадугледжваюцца Міністэрству культуры на падтрымку культуры і мастацтва;

адлічэнні за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей;

кампенсацыі за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей;

бязвыплатная (спонсарская), у тым ліку замежная, дапамога, ахвяраванні;

іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. Сродкі фонду могуць быць накіраваны:

3.1. на ажыццяўленне культурных праектаў па:

рэалізацыі мер, накіраваных на выяўленне і ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей, правядзенне навукова-даследчых, праектных і рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, ажыццяўленне іншых мерапрыемстваў па зберажэнні і памнажэнні гісторыка-культурнай спадчыны;

стварэнні твораў мастацтва (у тым ліку на выплату ўзнагароджання творчым работнікам, набыццё абсталявання, матэрыялаў, музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў, дастаўку і ўстаноўку твора мастацтва);

арганізацыі і правядзенні культурных мерапрыемстваў (у тым ліку на выплату ўзнагароджання работнікам культуры, творчым работнікам і іншым асобам, якія прымаюць удзел у правядзенні культурнага мерапрыемства, набыццё матэрыялаў, музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў для культурнага мерапрыемства);

стварэнні экспазіцый музеяў (у тым ліку на набыццё неабходных для гэтага прадметаў музейнага значэння, абсталявання і матэрыялаў);

рэстаўрацыі кніжных помнікаў і стварэнні іх копій у электронным выглядзе (у тым ліку на набыццё неабходных для гэтага абсталявання і матэрыялаў);

вырабе архіўных копій кіна-, фота-, фона- і відэадакументаў, што належаць да беларускай нацыянальнай гісторыі і культуры;

стварэнні тэле-, радыёпраграм і перадач, прысвечаных беларускай нацыянальнай культуры;

3.2. на набыццё твораў мастацтва і кніжных помнікаў;

3.3. на аплату навучання (стажыровак) у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой работнікаў культуры, творчых работнікаў, а таксама навучэнцаў, аспірантаў, дактарантаў ва ўзросце звыш 31 года і педагагічных работнікаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях, звязаных з практычнай, творчай і навуковай дзейнасцю ў сферы культуры;

3.4. на выплату ўзнагароджання замежным спецыялістам у сферы культуры, запрошаным у Рэспубліку Беларусь для ўдзелу ў ажыццяўленні культурных праектаў, правядзенні тэарэтычных і практычных заняткаў, майстар-класаў, накіраваных на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку работнікаў культуры, творчых работнікаў, а таксама навучэнцаў, аспірантаў, дактарантаў ва ўзросце звыш 31 года і педагагічных работнікаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях, звязаных з практычнай, творчай і навуковай дзейнасцю ў сферы культуры;

3.5. на выплату штогадовых прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

4. Па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прынятым на аснове абгрунтаванай прапановы савета фонду, адобранай Міністэрствам культуры, могуць быць вызначаны іншыя напрамкі фінансавання за кошт сродкаў фонду, у тым ліку на ўмовах, не прадугледжаных дадзеным Палажэннем.

5. Крытэрыямі адбору прапаноў для фінансавання за кошт сродкаў фонду ў адпаведнасці з напрамкамі, вызначанымі ў падпунктах 3.1–3.4 пункта 3 гэтага Палажэння, з’яўляюцца:

5.1. высокая сацыяльна-культурная значнасць прапаноў для Рэспублікі Беларусь;

5.2. арыгінальнасць і наватарскі характар прапаноў;

5.3. накіраванасць прапаноў на захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускай нацыянальнай культуры;

5.4. плануемыя вынікі рэалізацыі прапаноў, перспектывы іх выкарыстання ў культурнай дзейнасці, чакаемы сацыяльны і (або) эканамічны эфект;

5.5. наяўнасць у прэтэндэнта на атрыманне сродкаў фонду кадравых і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў для паспяховай рэалізацыі прапаноў на працягу года, у якім выдзяляюцца сродкі фонду;

5.6. зацікаўленасць у рэалізацыі прапаноў (у тым ліку ў яе сафінансаванні) дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

6. Сродкі фонду размяркоўвае савет фонду, у склад якога ўваходзяць работнікі культуры і творчыя работнікі, а таксама прадстаўнікі зацікаўленых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

Члены савета фонду ажыццяўляюць сваю дзейнасць на бязвыплатнай аснове і не маюць права паведамляць асобам, якія не ўваходзяць у склад савета фонду, інфармацыю аб выніках пасяджэнняў савета фонду.

Склад савета фонду зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Савет фонду ўзначальвае старшыня, які нясе персанальную адказнасць перад Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь за забеспячэнне дзейнасці савета фонду ў адпаведнасці з гэтым Палажэннем. У выпадках адсутнасці старшыні савета фонду на пасяджэнні старшынствуе намеснік старшыні савета фонду.

Рашэнне савета фонду з’яўляецца канчатковым і не падлягае перагляду.

Склад савета фонду падлягае перыядычнай ратацыі не менш чым на адну трэць сваіх членаў не радзей чым адзін раз у пяць гадоў.

7. Для фінансавання культурных праектаў за кошт сродкаў фонду па напрамках, вызначаных у падпунктах 3.1 і 3.2 пункта 3 гэтага Палажэння, дзяржаўныя органы, арганізацыі культуры, установы адукацыі, грамадскія аб’яднанні і іншыя арганізацыі (далей, калі не вызначана іншае, – арганізацыі) падаюць у Міністэрства культуры штогод да 15 студзеня года, у якім выдзяляюцца сродкі фонду, наступныя дакументы:

заяўку на фінансаванне культурнага праекта (далей, калі не вызначана іншае, – заяўка), якая ўключае назву культурнага праекта, твора мастацтва, кніжнага помніка, абгрунтаванне ў адпаведнасці з крытэрыямі адбору, устаноўленымі ў пункце 5 гэтага Палажэння, тэрміны і этапы ажыццяўлення культурнага праекта або набыцця твора мастацтва, кніжнага помніка, звесткі аб бягучым фінансава-эканамічным становішчы арганізацыі і аб атрыманні ёю сродкаў фонду ў мінулым;

каштарыс расходаў;

заключэнні, якія пацвярджаюць зацікаўленасць арганізацый у рэалізацыі культурнага праекта або набыцці твора мастацтва, кніжнага помніка;

копію статута арганізацыі (за выключэннем дзяржаўных органаў) без натарыяльнага засведчання (іншага ўстаноўчага дакумента пры ажыццяўленні дзейнасці не на падставе статута);

копіі дакументаў, якія сведчаць асобу аўтара культурнага праекта або твора мастацтва і кіраўніка арганізацыі;

абгрунтаваную праграму навукова-даследчых і праектных работ або навукова-праектную дакументацыю на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях (да заяўкі на рэалізацыю мер, накіраваных на выяўленне і ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей, правядзенне навукова-даследчых, праектных і рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ, ажыццяўленне іншых мерапрыемстваў па зберажэнні і памнажэнні гісторыка-культурнай спадчыны);

тэкст п’есы, лібрэта, літаратурны сцэнарый фільма (да заяўкі на стварэнне твора мастацтва);

копію, фота- ці відэавыяву твора мастацтва, кніжнага помніка (да заяўкі на набыццё твора мастацтва, кніжнага помніка).

8. Для фінансавання культурных праектаў за кошт сродкаў фонду па напрамках, вызначаных у падпунктах 3.3 і 3.4 пункта 3 гэтага Палажэння, арганізацыі падаюць у Міністэрства культуры штогод да 15 студзеня года, у якім выдзяляюцца сродкі фонду, наступныя дакументы:

заяўку, якая ўключае назву напрамку фінансавання за кошт сродкаў фонду, абгрунтаванне ў адпаведнасці з крытэрыямі адбору прапаноў, устаноўленымі ў пункце 5 гэтага Палажэння, тэрміны і этапы навучання (стажыроўкі), правядзення тэарэтычных і практычных заняткаў, майстар-класаў, звесткі аб бягучым фінансава-эканамічным становішчы арганізацыі і атрыманні ёю сродкаў фонду ў мінулым;

каштарыс расходаў;

заключэнні, якія пацвярджаюць зацікаўленасць арганізацый у правядзенні тэарэтычных і практычных заняткаў і майстар-класаў, навучанні (стажыроўках) іх работнікаў культуры, творчых работнікаў, а таксама навучэнцаў, аспірантаў, дактарантаў ва ўзросце звыш 31 года і педагагічных работнікаў устаноў адукацыі па спецыяльнасцях, звязаных з практычнай, творчай і навуковай дзейнасцю ў сферы культуры;

копію статута арганізацыі (за выключэннем дзяржаўных органаў) без натарыяльнага засведчання (іншага ўстаноўчага дакумента пры ажыццяўленні дзейнасці не на падставе статута);

копію дакумента, які сведчыць асобу работніка культуры, творчага работніка, а таксама навучэнца, аспіранта, дактаранта ва ўзросце звыш 31 года і педагагічнага работніка ўстановы адукацыі па спецыяльнасці, звязанай з практычнай, творчай і навуковай дзейнасцю ў сферы культуры.

9. Заяўкі арганізацый, якія падпарадкоўваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, належаць узгадненню з адпаведнымі органамі дзяржаўнага кіравання, іншых прэтэндэнтаў – з абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі.

Міністэрства культуры мае права запатрабаваць у арганізацый іншыя матэрыялы, неабходныя для прыняцця саветам фонду абгрунтаванага рашэння аб падтрымцы заяўкі.

У выпадку наяўнасці неразмеркаваных сродкаў фонду дадатковыя заяўкі ў бягучым каляндарным годзе могуць прадстаўляцца да 1 мая гэтага года.

10. Прадстаўленне дакументаў на выплату штогадовых прэмій «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва праводзіцца ў парадку, прадугледжаным Палажэннем аб прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 2009 г. № 384 «О премии Президента Республики Беларусь «За духовное возрождение» и специальной премии Президента Республики Беларусь деятелям культуры и искусства» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2009 г., № 173, 1/10868).

11. Дакументы, якія не адпавядаюць патрабаванням, прадугледжаным у пунктах 7 і 8 гэтага Палажэння, саветам фонду не разглядаюцца і не пазней чым за 15 працоўных дзён з даты паступлення вяртаюцца арганізацыі, якая іх накіравала. Дата паступлення дакументаў вызначаецца датай іх рэгістрацыі ў Міністэрстве культуры.

12. Пададзеныя заяўкі накіроўваюцца Міністэрствам культуры на разгляд экспертнай камісіі, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, творчых саюзаў, а таксама вядомыя работнікі культуры і творчыя работнікі, педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі.

Экспертную камісію ўзначальвае старшыня. У выпадку адсутнасці старшыні экспертнай камісіі на пасяджэнні старшынствуе намеснік старшыні экспертнай камісіі. Склад экспертнай камісіі зацвярджаецца Міністэрствам культуры і падлягае перыядычнай ратацыі не менш чым на адну трэць сваіх членаў не радзей чым адзін раз у пяць гадоў.

У перыяд з 15 па 31 студзеня года, у якім выдзяляюцца сродкі фонду, экспертная камісія разглядае заяўкі і па выніках разгляду прадстаўляе савету фонду рашэнне аб мэтазгоднасці выдзялення сродкаў фонду.

Пасяджэнне экспертнай камісіі лічыцца правамоцным, калі ў ім удзельнічае не менш за палову яе членаў. Рашэнне прымаецца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных членаў камісіі, афармляецца пратаколам за подпісам старшыні камісіі або асобы, якая старшынствавала на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня камісіі або асоба, якая старшынствавала на пасяджэнні.

Пры неабходнасці да ўдзелу ў разглядзе заявак могуць прыцягвацца спецыялісты дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, якія не ўваходзяць у склад экспертнай камісіі.

Рашэнне экспертнай камісіі носіць рэкамендацыйны характар.

Члены экспертнай камісіі, спецыялісты арганізацый, прыцягнутыя да ўдзелу ў разглядзе заявак, ажыццяўляюць сваю дзейнасць на бязвыплатнай аснове і не маюць права паведамляць асобам, якія не ўваходзяць у склад камісіі, інфармацыю аб ходзе і выніках разгляду заявак.

Член экспертнай камісіі, які з'яўляецца аўтарам (кіраўніком) культурнага праекта, мерапрыемства або мае сваяцкія сувязі з такімі асобамі, не мае права ўдзельнічаць у пасяджэнні экспертнай камісіі.

У выпадку наяўнасці неразмеркаваных сродкаў фонду дадатковыя заяўкі ў бягучым каляндарным годзе разглядаюцца экспертнай камісіяй з 1 па 15 мая гэтага года.

13. Да 15 лютага года, у якім выдзяляюцца сродкі фонду, заяўкі разглядаюцца на пасяджэнні савета фонду на конкурснай аснове. Падтрымка заявак ажыццяўляецца ў выглядзе поўнага або частковага фінансавання.

Пасяджэнне савета фонду лічыцца правамоцным, калі ў ім удзельнічае не менш за палову членаў савета фонду. Рашэнне прымаецца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных членаў савета фонду, афармляецца пратаколам за подпісам старшыні савета фонду або асобы, якая старшынствавала на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня савета фонду або асоба, якая старшынствавала на пасяджэнні.

Пры неабходнасці да ўдзелу ў рабоце савета фонду прыцягваюцца члены экспертнай камісіі, спецыялісты арганізацый, якія прымалі ўдзел у разглядзе заявак.

Член савета фонду, які з'яўляецца аўтарам (кіраўніком) культурнага праекта, мерапрыемства або мае сваяцкія ці прафесійныя сувязі з такімі асобамі, не мае права ўдзельнічаць у пасяджэнні савета фонду.

У выпадку наяўнасці неразмеркаваных сродкаў фонду дадатковыя заяўкі ў бягучым каляндарным годзе разглядаюцца на пасяджэнні савета фонду да 1 чэрвеня гэтага года.

14. Па выніках пасяджэння савета фонду Міністэрства культуры да 1 красавіка года, у якім выдзяляюцца сродкі фонду, ва ўстаноўленым парадку рыхтуе праект распараджэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб зацвярджэнні рашэння савета фонду (далей – праект распараджэння), узгадняе яго з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі і ўносіць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Праект распараджэння накіроўваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку.

Да праекта распараджэння прыкладаюцца звесткі па кожнай кандыдатуры аўтараў (кіраўнікоў) культурных праектаў, прэтэндэнтаў на навучанне і стажыроўку, падрыхтаваныя Дзяржаўным сакратарыятам Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь у выніку праведзенай у дачыненні да іх праверкі.

У выпадку неўзгаднення зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі праекта распараджэння заяўкі падлягаюць паўторнаму разгляду на пасяджэнні савета фонду ў месячны тэрмін з дня паступлення адпаведных аргументаваных пісьмовых заўваг (прапаноў). Пры гэтым неўзгадненне па прычыне немэтазгоднасці рэалізацыі прапаноў не дапускаецца.

15. Арганізацыі, якім выдзелены сродкі фонду ў адпаведнасці з напрамкамі, вызначанымі ў падпунктах 3.1–3.4 пункта 3 гэтага Палажэння, не пазней за 1 сакавіка года, што ідзе за годам, у якім выдзелены сродкі фонду, накіроўваюць у Міністэрства культуры справаздачы аб рэалізацыі іх прапаноў.

Міністэрства культуры штогод не пазней 1 мая года, што ідзе за годам, у якім былі выдзелены сродкі фонду, накіроўвае Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь справаздачу аб дзейнасці фонду ў мінулым годзе.

16. Міністэрства фінансаў у адпаведнасці з заяўкай Міністэрства культуры штогод пры фарміраванні праекта рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы год прадугледжвае Міністэрству культуры сродкі на падтрымку культуры і мастацтва.

17. Арганізацыйна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці фонду, накапленне і расходаванне сродкаў фонду ажыццяўляюцца Міністэрствам культуры.

18. Адказнасць за выкананне патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь пры выкарыстанні сродкаў фонду, якія выдзяляюцца на мэты, прадугледжаныя дадзеным Палажэннем, ускладаецца на Міністэрства культуры.

19. Кіраўнікі арганізацый, якім выдзелены сродкі фонду, нясуць персанальную адказнасць за мэтавае выкарыстанне гэтых сродкаў.

20. У выпадку, калі выдзеленыя сродкі фонду не былі выкарыстаны, арганізацыя вяртае іх на рахунак, з якога яны атрыманы.

21. Справаздачы аб расходаванні сродкаў фонду з прадастаўленнем першасных уліковых і справаздачных фінансавых дакументаў прадстаўляюцца ў Міністэрства культуры не пазней за 15 снежня года, у якім выдзелены сродкі фонду.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта<br>Рэспублікі Беларусь<br>13.12.2004 № 601<br>(у рэдакцыі<br>Указа Прэзідэнта<br>Рэспублікі Беларусь<br>16.08.2019 № 309)

**СКЛАД**<br>**савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва**

| | | |
|---|---|---|
| Карчэўская Наталля Уладзіміраўна | – | рэктар установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт (старшыня савета фонду) |
| Бузоўскі Ігар Іванавіч | – | намеснік Міністра інфармацыі (намеснік старшыні савета фонду), кандыдат сацыялагічных навук |
| Манакова Людміла Мікалаеўна | – | кансультант упраўлення прафесійнага мастацтва галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры (сакратар савета фонду) |
| Бахановіч Аляксандр Генадзьевіч | – | першы намеснік Міністра адукацыі, доктар тэхнічных навук, дацэнт |

| | |
|---|---|
| Брэль<br>Віталій Пятровіч | – начальнік ўпраўлення культуры Мінскага гарвыканкама |
| Бысюк<br>Рыгор Рыгоравіч | – дырэктар дзяржаўнай установы «Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» |
| Данільчык<br>Алена Валерыянаўна | – начальнік аддзела фінансавання культуры і сродкаў масавай інфармацыі галоўнага ўпраўлення фінансавання сацыяльнай сферы і навукі Міністэрства фінансаў |
| Заўгародняя<br>Інга Сяргееўна | – першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама |
| Касцючэнка<br>Канстанцін Аляксандравіч | – дацэнт кафедры скульптуры ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» |
| Лойка<br>Аляксандр Часлававіч | – дырэктар установы «Музей «Замкавы комплекс «Мір» |
| Ляйко<br>Юрый Аляксандравіч | – дырэктар установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| Пяткевіч<br>Іосіф Еўстаф’евіч | – начальнік упраўлення адукацыі і сацыяльна-культурнай сферы Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь |
| Раінчык<br>Васілій Пятровіч | – рэпетытар па вакале дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Маладзёжны тэатр эстрады», народны артыст Беларусі |
| Румак<br>Аляксандр Аляксеевіч | – Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей |
| Сарокіна<br>Ілона Уладзіміраўна | – дырэктар установы культуры «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна» |
| Эйсмант<br>Наталля Мікалаеўна | – прэс-сакратар Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь |
| Яфрэмаў<br>Аляксандр Васільевіч | – кінарэжысёр, мастацкі кіраўнік тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», народны артыст Беларусі |